**Oblicza Epok. Język Polski. Podręcznik. Klasa 3. Część 1. Liceum i technikum. Zakres podstawowy i rozszerzony. Autorzy: Dariusz Chemperek,  Adam Kalbarczyk, Dariusz Trześniowski . Wydawnictwo WSiP, 2021.**

**Падручнік па літаратуры, мастацтве і польскай мове для 3 класа агульнаадукацыйных ліцэяў і тэхнікумаў. Частка 1.Базавы і пашыраны ўзроўні. Аўтары: Дар'юш Хампэрак, Адам Кальбарчык, Дар'юш Тшасьнёўскі. Выдавецтва «WSiP», 2021.**




**У падручніку для 3 класа, ч. 1, змешчаныя тэксты Фёдара Дастаеўскага(урыўкі са «Злачынства і пакарання»), а таксама творцаў**

**Маладой Польшчы: сярод іншага, апавяданне Стэфана Жаромскага «Раздзяўбуць нас крумкачы, вароны…», вершы Казімежа Пшэрвы-Тэтмаера, Яна Каспровіча, Леапольда Стафа, урыўкі з драмы Станіслава Выспяньскага «Вяселле», рамана Уладзіслава Ст. Рэйманта «Сяляне».**

**У гэтую частку кнігі ўвайшлі таксама тэксты міжваеннага перыяду — класічнага напрамку, напр., урыўкі з рамана Жаромскага «Прадвесне»; паэзія Марыі Паўлікоўскай-Яснажэўскай, Баляслава Лесьмяна, Юзафа Чаховіча, урыўкі з празаічных твораў Бруна Шульца, Вітальда Гамбровіча («Ferdydurke») і інш.**

**Вучэбны матэрыял падручніка размешчаны ў храналагічным парадку і падзелены на ўрокі. Тэарэтычныя веды пра эпоху шчыльна звязаныя з практычнымі навыкамі, бо матэрыял інтэрпрэтуецца ў першую чаргу з дапамогай глыбокага аналізу і асэнсавання тэксту: каментары ў пачатку кожнага ўрока, неабходныя тлумачэнні асноўных паняццяў і заданні пасля тэкстаў дазваляюць грунтоўна прачытаць творы, вучыцца навыкам інтэрпрэтацыі, падвышаць адчувальнасць да каштоўнасных тэкстаў (падраздзел «Каштоўнасці і пазіцыі»), развіваць рытарычныя навыкі навучэнцаў – такія, як, напрыклад, аргументацыя, абгрунтаванне меркаванняў, вядзенне дыскусіі вакол дадзенай праблемы), а таксама інтэграванне розных ведаў і ўменняў (пры ўроках літаратуры і культуры колерам вылучаюцца інструкцыі па вывучэнні мовы, стварэнні пісьмовых выказванняў і**

**самаадукацыйных праектных заданняў па праблематыцы тэкстаў, якія разглядаюцца).**

**Каб паказаць навучэнцам актуальнасць даўняй літаратуры, тэксты эпохі супастаўленыя з сучасным кантэкстам, у тым ліку з масавай культурай, яны адабраныя як праз падабенства матываў, так і праз разнастайнасць сродкаў выразу (гаворка ідзе, напрыклад, пра кіно, музыку, тэатр, візуальныя мастацтвы, стрыт-арт). Сярод такіх кантэкстаў ёсць і літаратурныя творы, напр., п'еса «Вяселле» Станіслава Выспяньскага ў кантэксце фільма «Вяселле» рэжысёра Войцеха Смажоўскага.**